*Пролетарыі усіх краін, еднайцеся!*

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

Орган парткома, рэктарата, камітэта ЛКСМБ, прафкома і мясцкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя В. І. Леніна

№ 13 (291) | СУБОТА, 11 мая 1957 г. | Цана 20 кап.

СЁННЯ Ў НУМАРЫ:

* Сесія пачалася
* Абаронцы Брэста ў БДУ
* Чытач прапануе
* Актывісты друку
* Радыё і яго задачы
* Спартыўная хроніка

*11 мая 1957 года пісьменніцы Этэль Лілian Войніч споўніцца 93 гады. Многія студэнты нашага універсітэта паслалі свае віншаванні аутару бессмярот нага «Овода».*

*Гэты здымак зроблен у той момант, калі студэнты III курса аддзялення фізікі Міхаіл Анкуда, Нікалай Глебко і Нікалай Каратаеу пісалі пісьмо Э. Л. Войніч.*

*— Дарагая Этэль Лілian Войніч,—закончылі яны сваё пісьмо,—кожны совецкі чалавек—ваш сябра!*

*Фото М. ПІЛЬШЧЫКАВА.*

# ЛЕКЦЫІ, СЕМІНАРЫ, ЭКЗАМЕНЫ

* * *

## Сесія ідзе

Пачалася летняя экзаменацыйная сесія на некаторых факультэтах. Па-рознаму адносяцца да яе студэнты. Адны чакалі сесію з вялікім жахам, нават жадалі, каб пачалася яна пазней, другія сустракаюць яе упэўнена.

Вось да гэтых другіх адносяцца студэнты IV курса біёлага-глебавага факультэта. Адным з самых адказных экзаменаў, якія ім прыдзецца здаваць у гэтую сесію, з'яуляецца дыялектычны матэрыялізм, семінары па якіх праходзілі надзвычай актыуна.

На адным з апошніх заняткаў студэнты разбіралі твор Леніна «Матэрыялізм і эмпірыякрытыцызм». Перад заняткамі заусёды дзелавая абстаноука. Усё галоуное заканспектавана—прыходзіцца толькі яшчэ раз прагледзець канспект. На прапанову выкладчыка: «Хто жадае адказаць?» адразу ўзнімаецца цэлы «лес» рук.

З падрабязным і глыбокім адказам на пытанне аб пазнавальнасці свету выступае студэнтка Канстанцінава.

На гэтым курсе увайшло у сістэму тое, што кожны выступаючы дае сваю ацэнку адказу папярэдняга таварыша і разам з тым дае план свайго адказу. Гэта прымушае студэнтаў уважліва слухаць сваіх таварышаў і выступаць з дапаўненнямі.

Семінарскія заняткі заусёды праходзілі ажыулена. Нярэдка спрэчнае пытанне, узнятае у час семінара, абмяркоуваецца і на перапынку. Семінарскія заняткі набываюць форму жывой гутаркі студэнтаў. Асаблівай актыунасцю вызначаюцца студэнты Бесман, Хадыка, Чарнавусава і многія другія.

Чацвертакурсніцы біёлага-глебавага факультэта ужо здалі экзамены па сельгасмеліярацыі, расліноводству і лугаводству. Выдатныя адзнакі атрымалі Т. Голуб, В. Еусеева, І. Пашына, Н. Якімовіч і многія іншыя. У гэтай групе толькі адна здавальняючая адзнака.

**А. ЧАЛІНА.**

## НЕ НАВУЧЫЛІСЯ...

Комсамольскую арганізацыю II курса юрыдычнага факультэта, як відаць, мала цікавяць пытанні вучобы і самастойнай работы студэнтаў. За увесь першы семестр не было ніводнага комсамольскага сходу, на якім-бы пагаварылі аб вучобе. Пропускі лекцый і практычных заняткаў, дрэнная падрыхтоука да семінараў, няуменне асобных студэнтаў правільна распараджацца сваім вучэбным часам—усё гэта праходзіла па-за увагай курсавога бюро. А на экзаменах шмат студэнтаў атрымалі нездавальняючыя адзнакі. Нават сама Людміла Кістрынава — комсорг курса—«завалiла» крымінальнае права.

Здавалася-б, што у новым семестры другакурснікі сур'ёзна возьмуцца за справу. Але прайшло шмат часу, а становішча на курсе застаецца ранейшым. Многія студэнты нават пасля такога горкага уроку не навучыліся распараджацца сваім часам, па-ранейшаму прапускаюць заняткі.

Адзінаццаць гадзін за сакавікрасавік прапушчана у Эдуарда Гаркавага, 12 гадзін—у Івана Жураулёва.

Леанід Сухаверхі не заусёды з'яуляецца на заняткі па англійскай мове. Таму і веды яго па гэтаму прадмету далёка не бліскучыя. Нярэдка прапускае практычныя заняткі Александр Макарэвіч, а калі і з'яуляецца на іх, то, як правіла, непадрыхтаваным.

Было-б вельмі добра, каб комсамольскае бюро факультэта навучыла некаторых студэнтаў правільна выкарыстоуваць свой час.

**О. СЦЕПАНЕНКА.**

## ЗВЯРНІЦЕ ЎВАГУ!

— Ты ідзеш на лекцыю?

— Кажуць, праверка сёння будзе. Прыдзецца пасядзець якую гадзіну.

Прыкладна такія размовы можна пачуць перад пачаткам лекцыі па гісторыі КПСС у студэнтаў II курса філалагічнага факультэта.

Чаму такая абыякавасць, чаму такія адносіны да лекцыі?

Зойдзем разам са студэнтамі ў аудыторыю.

Лекцыю чытае дацэнт В. І. Мацко. Яна цікавая, змястоуная. У ёй сабрана многа фактаў, якія паказваюць развіццё нашай прамысловасці і сельскай гаспадаркі, ролю нарты.

Не дзіўна, што другакурснік-журналіст Іван Старавойтау так захапіуся лекцыяй, што пяро яго самапіскі амаль не спыняецца—у сшытку паяўляюцца усё новыя і новыя радкі. Ён ведае, што такія факты, якія пададзены у лекцыі, у час падрыхтоукі да экзаменаў вельмі важныя. Каб іх знайсці, трэба прачытаць не адну кнігу, азнаёміцца не з адным часопісам.

Але яго раптам нехта злёгку штурхае у плячо, і амаль у той-жа момант на скамейку падае даволі ёмкі пакунак у газеце з прыпіскай «І. Старавойтаву». Раззлаваны, што адарвалі ад працы, ён разгортвае пасылку—амаль цалюткая нізка (грамаў чатыры ста) абаранкаў і запіска: «Перакусі трохі, а то змардаваўся, бедачок». Ззаду пачуўся спачатку прыглушаны смех, пасля—рогат, які можна пачуць нават на вулiцы.

Гэта нас насцярожвае. Позірк сам бяжыць па аудыторыі. І што мы бачым? Амаль перад кожным студэнтам ляжыць разгорнутая кніга.

Гарык Праваловіч (аддзяленне журналістыкі) і яго сябра Алег Сініцкі (аддзяленне рускай мовы і літаратуры) наперабой нешта вясёленькае і смешнае расказваюць Джэме Маслоускай (аддзяленне беларускай мовы і літаратуры). Усе утраіх аж пачырванелі ад смеху. Ніла Семяновіч (аддзяленне беларускай мовы і літаратуры) дастае з чамаданчыка пакупку—новы газавы каснічок. Ён хутка прабягае на руках сябровак, і між імі пачынаецца самае жывое, гаспадарскае і па-дзявочаму шчырае абмеркаванне апошніх мод. І ужо зусім забыушыся, што знаходзіцца на лекцыі, студэнтка аддзялення рускай мовы і літаратуры С. Чэчко расказвае сваёй сяброуцы А. Сямёнавай аб учарашнім вечары.

Шум настолькі узмацняецца, што з-за яго амаль не чуваць голасу выкладчыка. Ён спыніу чытанне. Але большасць студэнтаў нават не зауважае, што лекцыя спынена. Студэнткі аддзялення рускай мовы і літаратуры Л. Ляуданская і Р. Сакалова шпурляюць Івану Старавойтаву адну запіску за другой, у якіх абвінавачваюць яго у няудзячнасці за пасылку.

Так праходзіць першая гадзіна. Пасля перапынку многія студэнты зніклі. Не відаць больш В. Кляеускай, Л. Сіняковай, Э. Карпачова, А. Шчасновіча і іншых. Але і другая гадзіна праходзіць гэтак-жа шумна. Працоуная атмасфера у аудыторыі так і не устанавілася. У такіх умовах цяжка весці канспект, і многія не вядуць яго, бо праз парушальнікаў дысцыпліны не толькі нельга пісаць, але і слухаць. Былі дні, калі В. І. Мацко зусім пакідаў аудыторыю і прыходзіу толькі з намеснікам дэкана Г. В. Булацкім. Такія факты павінны былі стаць прадметам вялікіх размоу на комсамольскіх сходах курсаў. Але яны прайшлі бясследна.

Нельга не кінуць некалькі слоу папроку у адрас дэканата. У суботні дзень, калі заняткі на філфаку пачынаюцца у дванаццаць гадзін, у студэнтаў другіх курсаў беларускага і рускага аддзяленняў семінары па гісторыі КПСС, у журналістаў—замежная мова. Вядома, што падрыхтавацца да іх мала часу і многія вымушаны рыхтавацца на лекцыі. Нельга абыйсці міма і таго, што курс лекцый па грамадскіх дысцыплінах чытаецца для надта вялікай аудыторыі (130 чалавек). Дэканату трэба было арганізаваць дзве групы, тым больш, што студэнты-журналісты у сувязі з практыкай раней заканчваюць другі семестр. Курс лекцый па гісторыі КПСС цалкам не змогуць яны праслухаць.

**Б. ЧОРНЫ.**

## Вечар, прысвечаны Дню перамогі

У БДУ адбыуся вечар, прысвечаны Дню перамогі.

Даклад «XII гадавіна перамогі Совецкага Саюза над фашысцкай Германіяй» зрабіу А. В. Кірсанаў.

З успамінамі аб Вялікай Айчыннай вайне выступілі яе удзельнікі Е. А. Піскуноў, І. В. Гутараў, Н. І. Марэнка.

На вечары быў паказан кінофільм «Гэта не павінна паўтарыцца».

**Н. РОЖЫН.**

## БІБЛІЯГРАФІЧНЫЯ ВЕДЫ СТУДЭНТАЎ

Бібліяграфічныя веды патрэбны кожнаму культурнаму чалавеку у яго вучобе і рабоце. Нельга арыентавацца ва усёй масе выдаваемай друкаванай прадукцыі і адбіраць самае неабходнае, каштоунае і важнае без бібліяграфіі.

Пры падрыхтоўцы даклада, навуковага даследавання, курсавой работы перш за усё неабходна выявіць, які фактычны матэрыял ужо сабраны, дзе і як ён абагулен, які пункты гледжання існуюць па данаму пытанню і г. д.

Для выяулення усяго гэтага звяртаюцца да бібліяграфіі адпаведнай літаратуры.

Бібліятэка БДУ удзяляе вялікую увагу арганізацыі бібліяграфічнай работы і прапагандзе бібліяграфічных ведаў сярод сваіх чытачоу.

У пачатку 1955 года быу арганізаван даведачна-бібліяграфічны аддзел бібліятэкі, у якім знаходзяцца каталагі і картатэкі, бібліяграфічныя паказальнікі, летапісы і г. д.

Работнікі даведачна-бібліяграфічнага аддзела штодзённа аказваюць вялікую дапамогу студэнтам у падборы літаратуры для заняткаў, дакладаў і г. д. Пры гэтым студэнт падбірае матэрыял самастойна, а работнік бібліятэкі толькі кансультуе наведвальніка, як карыстацца каталагам, летапісамі, бібліяграфічнымі паказальнікамі. Такім чынам студэнт набывае навыкі самастойнага падбору літаратуры, атрымлівае неабходныя веды аб метадах бібліяграфічнага адшукавання. Пры наступным наведванні даведачнага аддзела ён ужо самастойна працуе.

У мэтах прапаганды бібліяграфічных ведаў у бібліятэцы вывешаны плакаты у дапамогу самастойнаму падбору літаратуры, маецца пастаянная выстаука «Карыстайцеся бібліяграфічнымі паказальнікамі».

Аднак узровень бібліяграфічнай падрыхтоукі студэнтаў недастатковы. Гэта відаць нават у няуменні правільна выпісаць з каталага патрэбную кнігу. Вялікія цяжкасці выклікае у студэнтаў афармленне раздзела «Бібліяграфія» да курсавых і дыпломных работ. Адсутнасць элементарных бібліяграфічных ведаў нярэдка сказваецца і пры афармленні дысертацый.

Усё гэта гаворыць аб неабходнасці сур'ёзнага падыходу да гэтага пытання. Пажадана, каб кароткі курс бібліяграфіі чытаўся на усіх факультэтах універсітэта.

Бібліятэка у сваю чаргу прыкладзе усе намаганні для больш шырокай прапаганды бібліяграфічных ведаў.

**З. РАХМАНЧЫК,**
старшы бібліёграф,
**А. СІНЬКЕВІЧ,**
бібліёграф.

*На першамайскай дэманстрацыі ідуць знаменосцы БДУ імя В. І. Леніна.*

*Фота М. ПІЛЬШЧЫКАВА.*

## ЛІЧБЫ і ФАКТЫ

У 1913 годзе у Расіі выходзіла 859 газет, тыраж іх складаў 2,7 мільёна экземпляраў.

У сучасны момант у СССР выдаецца 7500 газет з тыражом больш 53,5 мільёнаў экземпляраў, больш 2500 часопісаў і іншых перыядычных выданняў. 2507 газет выходзіць на нацыянальных мовах.

☆ ☆ ☆

Орган Цэнтральнага Камітэта КПСС «Правда» у Ленінградзе, Кіеве, Куйбышэве, Львове, Ташкенце, Алма-Аце, Одэсе, Баку, Хабараўске, Іркутску і радзе іншых буйнейшых гарадоў краіны друкуецца з матрыц, якія дастауляюцца самалётамі. У многіх гарадах з матрыц друкуюць «Известия» і «Комсомольскую правду».

Вось ужо другі год як і у Беларусь самалёт штодзённа дастауляе матрыцы «Правды» і газета друкуецца у Мінску.

☆ ☆ ☆

У царскай Расіі у 1913 годзе на тэрыторыі Беларусі выходзіла 19 газет, якія выдаваліся у такіх гарадах, як Мінск, Гомель, Віцебск, Магілёў, Полацк і іншыя. Газеты, як правіла, выходзілі на рускай мове (з колькасці 19 газет 17 выдавалася на рускай мове).

Беларускі народ не меў ніводнай масавай газеты на роднай мове.

У сучасны момант у БССР выдаецца 10 рэспубліканскіх, 7 абласных, 164 раённых, больш 300 галінных ведамасных і агульнакалгасных шматтыражных газет і 15 часопісаў агульным тыражом да 2-х мільёнаў экземпляраў.

## Да студэнтаў прышлі жаданыя госці

Да студэнтаў прышлі жаданыя госці. Бурнымі апладысментамі пакрываецца аўдыторыя, калі пісьменік Сяргей Смірноў прадстауляе сабраўшымся удзельнікаў гераічнай абароны Брэсцкай крэпасці. Сэрца кожнага напауняецца гонарам за гэтых простых, сумленных і разам з тым адважных людзей.

Вось яны—героі Брэста! Самыя звычайныя людзі нашай Радзімы. Гэта былы малодшы лейтэнант 125-га стралковага палка, зараз рабочы-будаўнік П. Е. Сівакоў, былы малодшы сержант. а зараз канцэртмейсцер Белдзяржфілармоніі К. І. Сабалеўскі, гэта малады драматург А. І. Махнач, былы выхаванец БДУ імя В. І. Леніна, зараз настаўнік П. С. Сук, рабочы радыёзавода А. Л. Петліцкі, калгаснік з Мінскага раена В. І. Ляшкевіч і многія іншыя абаронцы—героі.

Доўгі час лічылі, што з удзельнікаў гераічнай абароны нікога не засталося у жывых. Але дзякуючы вялікай працы і няспынным пошукам пісьменніка С. Смірнова зараз ужо вядома каля 300 удзельнікаў абароны, якія жывуць у розных кутках нашай неабсяжнай Радзімы.

С. Смірноў расказаў студэнтам аб тым, як ён шукаў герояў Брэста, аб іх подзвіге.

— Для рускага чалавека слова «Варяг» на доўгія гады застанецца сімвалам храбрасці і беспрыкладнай мужнасці,—гаворыць С. Смірноў.—Такім-жа «Варягом» з'яўляецца і Брэсцкая крэпасць, толькі «Варягом» совецкай эпохі!

З асаблівым хваляваннем праслухалі студэнты расказ пісьменніка аб легендарным героі Брэста маёры П. М. Гаўрылаве. Мужнасці гэтага простага рускага чалавека дзівіліся нават ворагі. Калі яго, страціўшага прытомнасць ад голаду і невыносай смагі, аброшага баradой да непазнавальнасці, фашысты узялі ў палон, нямецкія афіцэры прыходзілі проста паглядзець на гэтага храбрага рускага воіна.

Са сваімі успамінамі аб днях гераічнай абароны выступілі А. І. Махнач, К. І. Сабалеўскі, А. Л. Петліцкі.

Тры гадзіны цягнулася гэтая сустрэча студэнтаў з пісьменнікам С. Смірновым і абаронцамі Брэсцкай крэпасці. Кожны, хто пабываў на ей, скажа: «Гэта была не проста цікавая сустрэча, гэта—незабыўная, цудоўная сустрэча!»

**В. МАЦКЕВІЧ.**

## Чытач прапануе...

У адным з апошніх нумароў газеты мы звярнуліся да нашых чытачоў з просьбай адказаць, якія матэрыялы, змешчаныя у газеце, спадабаліся ім, якія пытанні асвятляюцца слаба, што-б жадалі прачытаць нашы чытачы.

Мы атрымалі адказы, якія змяшчаем ніжэй.

* * *

*Мне асабліва запомніліся нарыс «Педагог» Н. Сакалова, вершы Генадзія Бураўкіна, фотаэцюд «Перад фотапаратам бацькі» Э. Дамарацкага, рэпартаж «У нашых сяброў» (аб жыцці студэнтаў тэатральнага інстытута).*

*Здаецца, што слабей за ўсё газета асвятляе важнейшае пытанне—маральнае выхаванне моладзі. Газета не вядзе пастаяннай мэтанакіраванай размовы на гэтую тэму. Амаль зніклі са старонак вострыя матэрыялы, якія бічавалі-б адмоўныя якасці чалавечага характару, кляймілі-б фальшывае і гнілое.*

*Газета недастаткова глыбока асвятляе пытанні вучэбнай, навукова-даследчай, партыйнай і комсамольскай работы. Было-б пажадана, каб газета завязала шырокае абмеркаванне «балючых» пытанняў нашага жыцця.*

*Перад фестывальным святам вельмі хацелася-б пачытаць паведамленне, што у нашым скверыку, нарэшце, заіскрыліся пад сонцам струмені фантана, а скульптурная група хлопчыкаў і дзяўчынак у цэнтры яго ветліва запрашае ўдзельнікаў фестывалю сфатаграфавацца разам з імі.*

*Н. ВАСІЛЕЎСКІ, студэнт.*

* * *

*Патрэбным быў артыкул С. Шчэрбы «Прафорг—кіраўнік і памочнік». Цікавы фельетон «Страказа» В. Салановіча. Гэтыя матэрыялы мне асабліва спадабаліся.*

*На маю думку, слаба асвятляюцца ў газеце «Беларускі універсітэт» пытанні культуры паводзін студэнтаў, культуры мовы, густу.*

*Па пытаннях вучэбнай работы часта змяшчаюцца павярхоўныя, не злобадзённыя матэрыялы, не паказваецца вопыт работы лепшых выкладчыкаў, выдатнікаў вучобы.*

*Хочацца, каб нас пазнаёмілі з фестывальнай праграмай самадзейнасці універсітэта. Было-б вельмі пажадана, каб па пісьмах , змешчаных у газеце, прымаліся неадкладныя, дзейсныя меры. А яны, звычайна, застаюцца па-за увагай нашага кіраўніцтва.*

*В. ПАЎЛОВІЧ, студэнт.*

* * *

*Запамятаюся матэрыял «Не на стаім месцы».*

*Трэба больш асвятляць пытанні абаронна-масавай работы.*

*Хацеў-бы пачытаць аб рабоце струннага аркестра.*

*А. ІЛЬЮКОЎ, студэнт.*

## СУСТРЭЧА З ПІСЬМЕННІКАМ

Сустрэча з пісьменнікам. Горача абмяркоувалі студэнты філалагічнага факультэта раман Ул. Карпава «За годам год». Як аб праблемным творы, гаварыу аб рамане студэнт IV курса аддзялення журналістыкі Вячэслау Адамчык. Студэнт гэтага-ж курса Васіль Нікалаенка звярнуў увагу на мову рамана. На вобразах Зосі і Аляксея спыніўся студэнт III курса аддзялення журналістыкі Уладзімір Скапа, на вобразах архітэктараў—Юркевіча, Барушка, Понтуса—студэнт V курса аддзялення журналістыкі Іван Чыгрынаў.

На абмеркаванні прысутнічаў аутар рамана Уладзімір Карпаў.

**Н. ІВАНША.**

## Я ЗАДАВОЛЕН СВАЁЙ РАБОТАЙ

У мінулым годзе я закончыу аддзяленне журналістыкі БДУ і быу накіраваны ў радашковіцкую раённую газету у якасці сакратара. Сказаць прауду, першыя месяцы давялося нялёгка: маленькая двухпалосная газета, незнаёмы і да таго-ж адсталы у эканамічных адносінах раён, адсутнасць транспарту у рэдакцыі. Але ўжо першыя месяцы работы прынеслі мне задавальненне. Вельмі радасна адчуваць, што твае артыкулы патрэбны чытачу, дапамагаюць выкрываць недахопы.

Цяпер наша газета ўжо чатырохпалосная, павялічыуся штат, узрасла колькасць пісьмау у рэдакцыю. Пры нашай рэдакцыі створана даволі шматлікае літаб'яднанне. Апрача палітычных і гаспадарчых матэрыялау мы сталі змяшчаць літаратурныя, гістарычныя матэрыялы на бытавыя і маральныя тэмы.

У сувязі з Днём друку мне хочацца павіншаваць усіх студэнтау аддзялення журналістыкі са звязам, пажадаць ім творчых поспехау, і разам з тым, запрасіць на практыку у нашу газету. А тым, хто заканчвае у гэтым годзе універсітэт, хочацца пажадаць не баяцца ехаць працаваць на раён. Гэта-ж так цікава і карысна! Хочацца яшчэ параіць будучым майстрам пяра больш глыбока вывучаць эканоміку нашай краіны, сельскую гаспадарку, звяртаць больш увагі на поліграфічнае афармленне газеты. Без гэтага людзям нашай прафесіі нельга ступіць ні кроку.

**А. МАЛЬДЗІС.**

*Былы выпускнік аддзялення журналістыкі Д. Мацяс зараз працуе загадчыкам сельскагаспадарчага аддзела свірскай раённай газеты «Заря». Нядауна ён наведау наш універсітэт і запрасіў журналістаў паехаць у іх газету на практыку.*

*НА ЗДЫМКУ: Д. Мацяс (другі справа) расказвае студэнтам аддзялення журналістыкі. З. Ткачовай, С. Блатуну і Н. Чайке аб сваёй рабоце.*

*Фота Н. БЕРАЖКОВА.*

40 ГОД НАЗАД.

## ГАЗЕТЫ Ў 1917 ГОДЗЕ

У перыяд ад лютага да кастрычніка 1917 года у Мінску выходзіу рад буржуазных і меньшавіцка-эсераускіх газет.

Усе гэтыя газеты імкнуліся звярнуць з правільнага шляху рэвалюцыйныя масы працоуных Беларусі і салдат фронта, накіраваць іх энергію на працяг імперыялістычнай вайны, адцягнуць іх ад задач рэвалюцыйнай барацьбы за уладу Советаў.

Газета «Известия», орган Мінскага Совета рабочых і салдацкіх дэпутатау, выходзіла з сакавіка да кастрычніка 1917 года. Гаворачы аб палітычным напрамку газеты, трэба мець на увазе, што хаця пасля майскіх перавыбараў састаў Совета у пераважнай колькасці быу на баку большэвікоў, у Выканкоме колькасны перавес меу эсераўска-меньшавіцкі блок. Уплыу большэвікоу у Совеце значна павялічыуся пасля вераснеускіх перавыбараў: большэвікі разам з падтрымліваючымі іх беспартыйнымі складалі 70 працэнтау новага Совета. Гэтымі абставінамі можна вытлумачыць той факт, што у газеце «Известия» побач з артыкуламі большэвікоу друкаваліся матэрыялы, у якіх праводзілі погляды меньшавікоу і эсэрау і іншых згодніцкіх партый па пытаннях рэвалюцыі у Расіі.

«Крестьянская газета»—орган Выканаучага Камітэта Советау сялянскіх дэпутатау Мінскай і Віленскай губерній, выходзіла з чэрвеня да жніуня 1917 года пад рэдакцыяй М. Міхайлава (М. В. Фрунзе).

27 ліпеня (9 жніўня) 1917 года выйшаў першы нумар газеты «Звезда», першай штодзённай большэвіцкай газеты у Беларусі, адразу-ж заваяваушай вялікую папулярнасць сярод працоўных і салдат Заходняга фронта. Непасрэдную дапамогу большэвікам Мінска і фронта у стварэнні газеты аказаў ЦК партыі. «Сабраушы апошнія капейкі,—успамінаў А. Ф. Мяснікоў,—адправілі аднаго з таварышоу у Піцер, у Цэнтральны Камітэт з чэлабітнай: пазычыць нам некаторую суму грошай для пачатку задуманай літаратурнай справы. Спадзяваліся і разам з тым меркавалі, што наурад-ці Цэнтральны Камітэт прыме на увагу просьбу маладой невядомай арганізацыі. Пасланец вярнуўся з 2 тысячамі рублёу. Была-ж радасць на нашай вуліцы. На гэтыя грошы мы маглі мець шэсць цэлых нумароу сваёй штодзённай газеты».

Тыраж «Звязды» бесперапынна ўзрастаў. Першы час друкавалася 3 тысячы экземпляраў, потым тыраж дасягнуу 16 тысяч.

Контрэволюцыйны Часовы ўрад праследаваў газету, некалькі разоу закрываў яе, але большэвікі зноу выпускалі яе пад другімі назвамі—«Молот», «Буревестник».

Вялікае было значэнне «Звязды» у справе прапаганды рашэнняу VI з'езду партыі, у барацьбе за ажыццяўленне гістарычных рашэнняу гэтага з'езду. Газета змясціла рад артыкулаў В. І. Леніна, якія давалі палітычную арыентыроуку партыйным арганізацыям, яна бязлітасна выкрывала імперыялістычную сутнасць Часовага Урада і варожую ролю меньшавікоу і эсэрау, растлумачвала большэвіцкія лозунгі супраць вайны, за мір, па зямельнаму пытанню, палітыку партыі па нацыянальнаму пытанню.

**М. ЗЕРНІЦКІ,**

Генадзій БУРАЎКІН

## МОЙ ЛЁС

Кажуць, ёсць у кожнага лёс...
Калі ёсць у мяне такі,
Гэта—шлях на тысячы вёрст,
Гэта—далі ва ўсе бакі,

Гэта—вецер у потны твар,
Гэта—дрогкі кузаў машын,
Гэта—сонца з-за шэрых хмар,
Гэта—песня з глубінь душы.

Гэта—рукі ў буграх мазалёу,
Нехаванае шчасце у вачах,
Гэта—дружба без гучных слоу,
Гэта—прауда ў вочы, з пляча.

Гэта—гора да ціхіх слёз
І каханне на ўсе вякі...
Кажуць, ёсць у кожнага лёс.
У мяне будзе толькі такі.

# Чытач прапануе...

*Добрыя матэрыялы, безумоўна, змяшчаюцца у газеце, але хочацца сказаць аб недахопах.*

*Газета рэдка узнімае на сваіх старонках такія важныя пытанні, як быт студэнтаў, каханне і дружба.*

*На старонках газеты мала цікавых сюжэтных фотаздымкаў.*

*Хацелася-б часцей чытаць нарысы, фельетоны, апавяданні.*

*В. АДАМЧЫК, студэнт.*

* * *

*З матэрыялаў, змешчаных у апошні час у нашай газеце, асабліва удалым трэба прызнаць артыкулы «Навуковая прадукцыя дацэнта Акінчыца» і «У абстаноуцы безадказнасці». У іх даецца прынцыповая крытыка недобрасумленнасці ў навуцы, у адносінах да грамадскіх абавязкаў.*

*Нягледзячы на шэраг удалых матэрыялаў, газета усё-ж недастаткова асвятляе навуковую работу на факультэтах.*

*Хацелася-б убачыць на старонках газеты выступленні вядучых вучоных па пытаннях арганізацыі эксперыментальных работ, парады маладым таварышам, якія толькі уступілі на шлях даследаванняў.*

*Нядрэнна было-б даваць у газеце кароткія рэцэнзіі на «Вучоныя запіскі» універсітэта і на іншыя работы, змешчаныя нашымі вучонымі у другіх часопісах.*

*Дзіуна, чаму дрэнна рэагіруюць на крытычныя матэрыялы, змешчаныя ў газеце?*

*М. ГІЛЕВІЧ, аспірант.*

* * *

*Запомніліся пісьмы з цалінных зямель, а таксама уся старонка «Наш уклад у казахстанскі мільярд».*

*Было-б пажадана, каб больш глыбока і шырэй асвятлялася жыццё буйнейшага з факультэтаў—фізіка-матэматычнага.*

*Асвятленне важнейшых пытанняу—вучобы, навуковай работы і іншых наогул задавальняе нас.*

*У бліжэйшых нумарах газеты хацелася-б пачытаць аб прадстаячым Маскоускім фестывалі, аб магчымасці паехаць асабіста на гэтае свята.*

*Э. ЛЕАНОВІЧ, студэнт.*

* * *

*Былі надрукаваны добрыя вершы К. Цвіркі, Г. Бураўкіна.*

*Навуковая работа студэнтаў асвятляецца слаба (можа таму, што ею мала займаюцца?).*

*Аб выхаваўчай рабоце гаворыць дастаткова, а на самой справе яе няма. У нас мала студэнтаў прымаюць удзел у грамадскай рабоце. Таму і астятляецца яна слаба.*

*Хацелася-б пазнаёміцца з планам правядзення універсітэцкага фестывалю.*

*Б. ЦІХАНОВІЧ, студэнтка.*

* * *

*Мне здаецца, што часцей трэба змяшчаць матэрыялы аб рабоце кабінетаў і лабараторый. Нядрэна было-б, на мой погляд, друкаваць урыукі з курсавых, гуртковых работ, каб было у чытача уяуленне аб навуковай рабоце студэнтаў. Хочацца часцей чытаць у нашай газеце цікавыя апавяданні.*

*І. ДОЛБІК, лабарантка.*

* * *

*У газеце быу змешчан рад цікавых матэрыялаў. Але разам з тым многа недапрацаваных.*

*Фота М. Пільшчыкава вызначаюцца, звычайна, адсутнасцю творчага падыходу да справы.*

*Адмоуна тое, што пытанні дрэнных паводзін студэнтаў застаюцца па-за увагай газеты.*

*Н. ПІНЧАНКА, студэнт.*

# РАДЫЁ і нашы ЗАДАЧЫ

Вялікае адкрыццё А. С. Папова у 1895 годзе, 40 год таму назад, было пастаулена на службу рэволюцыйнаму пролетарыяту Расіі. З гэтага часу радыё у нашай краіне стала неад'емным ад барацьбы за новы грамадскі лад, народжаны у агні Кастрычніцкай рэволюцыі.

1917 год—год Вялікага Кастрычніка—быў разам з тым пачаткам бурнага развіцця радыё у нашай краіне. 7-га лістапада 1917 года з радыёстанцыі крэйсера «Аурора» быу перададзен гістарычны зварот «Да грамадзян Расіі», падпісаны В. І. Леніным, які абвясціу аб перамозе социялістычнай рэволюцыі у нашай краіне. Хутка пасля Кастрычніцкіх дзён В. І. Ленін прапанаваў ажыццявіць ідэю шырокавяшчання, назваушы радыё газетаи без бумагі і адлегласці, якую трэба як мага хутчэй зрабіць даступнай для усіх працоуных.

У цянерашні час збылася мара В. І. Леніна—у СССР налічваецца ужо звыш 30 мільёнаў радыёустановак. Больш ста мільёнаў чалавек штодзённа слухаюць радыёперадачы на 80 мовах народаў СССР і на многіх замежных мовах.

Радыё трывала увайшло ў быт народа. Яно звязвае усіх працоуных нашай краіны у адзіную сям'ю будаунікоу комунізма. Совецкае радыё—магутны рычаг социялістычнай культуры, навукі і тэхнікі.

У рашэннях XX з'езду КПСС прадугледжана павелічэнне тэмпау далейшага развіцця шматлікіх галін радыё: радыёвяшчання, тэлебачання, радыёлакацыі, радыёнавігацыі, радыёаутаматыкі і розных прымяненняу радыёэлектронікі ва усіх галінах навукі і тэхнікі ад медыцыны і біялогіі да атамнак энергетыкі і астраноміі.

На службу радыё пастаулен новы раздзел навукі — фізіка поуправаднікоу, адкрыушая новую эру у развіцці радыёапаратуры, электронна-вылічальных машын, аутаматыкі.

Прымяненне поуправаднікоых прыбораў дазваляе будаваць мініятурныя перадатчыкі і прыемнікі, якія змяшчаюцца у корпусе ручных гадзіннікаў, а выкарыстанне поуправаднікоу у якасці пераутваральнікаў энэргіі атамных вылучэнняу дазваляе будаваць доугавечныя мініятурныя крынцы энергіі для поуправаднікоай апаратуры.

Прымяненне новай поуправаднікоай тэхнікі намнога спрашчае канструяванне вузлоу аутаматычных ліній, цэхаў, заводаў.

Надзвычай багатыя перспектывы адкрываюць вынікі даследаванняу у галіне мікрахвалявай радыётэхнікі, выкарыстоуваючай электрамагнітныя хвалі з даужынёй ад некалькіх сантыметрау да міліметрау.

Прымяненне гэтага дыяпазона электрамагнітных хваль дазволіць перадаваць тэлебачанне на многія сотні і тысячы кілометрау і весці адначасова да 600 тэлефонных размоу па аднаму і таму-ж каналу.

Вялікія работы па расшырэнню прымянення ультракароткіх хваль для радыёвяшчання і тэлебачання ажыццяуляюцца ужо у бягучай пяцігодцы. Так, у БССР будуць пабудаваны тэлевізійныя цэнтры у пяці абласцях, а трансляцыйныя устаноукі ствараюцца ва усіх буйных гарадах рэспублікі.

На прадпрыемствах пашыраецца выраб радыётэхнічнай апарагуры на аснове навейшай тэхнікі.

Універсальнасць сродкау і метадау радыётэхнікі настолькі вялікая, што у сучасны момант ужо не магчыма назваць ні воднай галіны навукі або тэхнікі, у якой не прымяняліся-б прыборы, спосабы змярэнняу ці даследаванняу, так ці інакш звязаныя з радыётэхнікай.

Да таго-ж трэба улічыць выключна важную ролю радыё у абароне краіны.

Гэтыя абставіны ставяць рад задач і перад Беларускім універсітэтам. Нельга лічыць нармальным такое становішча, калі студэнты прыродазнаучых факультэтаў пакідаюць сцены універсітэта, маючы толькі самыя агульныя уяуленні аб тэхніцы радыё, у сувязі з тым, што у існуючых праграмах курсау фізікі на нефізічных факультэтах пытанням радыё адводзіцца усяго 2—3 гадзіны. Таму было-б пажадана увядзенне на гэтых факультэтах невялікіх факультатыуных курсаў на асновах радыётэхнікі або радыётэхнічных метадаў вымярэнняу. Для студэнтаў фізікаў таксама метазгодна увесці спецкурсы па пытаннях радыё і радыёэлектронікі. Існуючую пры кафедры эксперыментальнай фізікі радыёлабараторыю трэба пашырыць і папоуніць навейшым абсталяваннем. Гэта дазволіць значна павысіць якасць падрыхтоўкі нашых фізікаў па пытаннях тэхнікі і фізікі радыё, што, безумоуна, мае вялікае значэнне для іх навуковай і практычнай дзейнасці, якая павінна быць звязана і з прапагандай радыётэхнічных ведаў.

**І.Г.НЕКРАШЭВІЧ,**
**дацэнт, загадчык кафедры эксперыментальнай фізікі.**

## ЛІЧБЫ І ФАКТЫ

У апошні час створан рад новых часопісау: «Вопросы истории КПСС», «Вопросы литературы», «Советская молодежь», «Спортивная жизнь России» и другие.

* * *

У СССР працуе больш 30 тысяч радыёвузлоу, якія абслугоуваюць каля 20 мільёнаў радыётрансляцыйных кропак.

* * *

Падрыхтоўка новых кадрау журналістау праводзіцца на факультэтах і аддзяленнях 13 універсітэтау краіны. У 29 партыйных школах на газетных аддзяленнях ідзе падрыхтоўка работнікаў друку.

Аддзяленне журналістыкі БДУ імя В. І. Леніна, створанае у 1944 годзе, мела 9 выпускаў. Яго закончылі 282 студэнта. За гэты-ж час завочнае аддзяленне журналістыкі закончыла 110 чалавек.

У 1957 годзе на стацыянары заканчвае 40, на завочным аддзяленні 18 студэнтаў. Выпускнікі працуюць у рэдакцыях раённых, абласных, а таксама рэспубліканскіх газет. Літсастау рэдакцый рэспубліканскіх маладзёжных газет «Чырвоная змена» і «Знамя юности» на 50 працэнтаў складаецца з выпускнікоу аддзялення журналістыкі БДУ імя В. І. Леніна.

## Амаль так робіцца наша газета




Расказ у малюнках А. КІЙРАНЕНА.

# Актывісты друку

### *Ніл ГІЛЕВІЧ*

Хто з нашых студэнтаў не ведае гэтага юнака? Любяць яго вершы беларускія чытачы. А нядауна выйшау першы зборнік маладога паэта «Песня у дарогу». Першымі з новымі вершамі Ніла знаёмяцца студэнты нашага універсітэта на старонках насценнай газеты «Слова філолага» і шматтыражкі «Беларускі універсітэт».

Зараз Ніл Гілевіч займаецца у аспірантуры. Ніл з'яуляецца членам рэдкалегіі насценнай газеты філалагічнага факультэта, актыуна удзельнічае у яе выпуску, падрыхтоувае літаратурны куток газеты.

### *Марк НЕМЕНМАН*

Сярод выстауленых на агляд у сувязі з Днём друку насценных газет агульную увагу прыцягвае газета фізіка-матэматычнага факультэта «За навуку». Газета усебакова асвятляе вучобу, культуру і быт студэнтау, навуковую работу факультэта. Сатырычны дадатак «Пылесос» б'е па недахопах, дапамагае іх выправіць.

Вялікая заслуга ва усім гэтым рэдактара газеты Марка Неменмана, студэнта IV курса фізмата. Марк—добры арганізатар, актыуны удзельнік не толькі «сваей» газеты, але і «Беларускага універсітэта».

— Адзін газеты я не раблю, —гаворыць Марк Неменман,— у нашай газеце актыуны удзел прымаюць Анатоль Межэнь, Валерый Гракау і іншыя.

### *Ала КАВАЛЕУСКАЯ*

Перад намі стройная светлавалосая дзяучына з блакітнымі вачыма. Гэта Ала Кавалеуская, студэнтка III курса хімічнага факультэта. Вось ужо год, як яна працуе рэдактарам «Бюлетэня СНО» хімфака.

— Цяжка было спачатку, але дапамаглі таварышы, выкладчыкі. Асабліва вялікую дапамогу аказвае нашай газеце кандыдат хімічных навук В. В. Свірыдау.

У газету пішуць выкладчыкі, аспіранты, студэнты. Пішуць аб навуковых студэнцкіх канферэнцыях, аб юбілеях вядомых вучоных. Ёсць у газеце асобны аддзел, у якім асвятляюцца навіны навукі. Усё гэта робіць наш бюлетэнь больш карысным, цікавым

Нялёгка, зразумела, спалучаць вучобу з такой адказнай работай, але Ала на усё знаходзіць час. Яна выдатніца вучобы, добра спрауляецца са сваімі «рэдактарскімі» абавязкамі.

### *Галя ШАТЭРНІК*

На геолага-геаграфічным факультэце выходзіць газета «Географ». Рэдактар яе— Галя Шатэрнік. Прауда, стаж яе рэдактарскай работы не вымяраецца гадамі вучобы ва універсітэце. На гэтай пасадзе яна першы год. А займаецца на IV курсе. Але за гэты час газета значна палепшылася, стала больш цікавай і дзейснай. Студэнты геафака добра ведаюць, што іх «Географ» не пройдзе міма ніводнай падзеі з студэнцкага жыцця, не пакіне без увагі цікавага факту.

Газета, у якой працуе Галя, добры памочнік студэнтау.

### *Нікалай ГЕСЬ*

Тры гады таму назад, закончыушы школу са срэбраным медалем, Нікалай Гесь марыу паступіць у наш універсітэт на аддзяленне журналістыкі. Вялікі конкурс медалістаў перашкодзіу Нікалаю ажыццявіць сваю мару. Ён паступіу на біёлага-глебавы факультэт. Але любоу і цікавасць да работы у газеце, да прафесіі журналіста у яго не прайшлі.

Тры гады Нікалай Гесь з'яуляуся членам рэдкалегіі сваёй факультэцкай газеты «За мічурынскую біологию». А у гэтым годзе яго абралі рэдактарам газеты. Ён працуе з душою. У рашэнні журы конкурса газета «За мічурынскую біологию» адзначаецца як адна з лепшых.

**Л. РАДЗІЁНАВА.**
**І. ШУЦІК.**

*Па ініцыятыве комсамольскай арганізацыі IV курса аддзялення журналістыкі адбылася сустрэча з журналістамі Мінска.*

*На сустрэчы у ліку іншых выступіу Георгій Шыловіч, супрацоунік рэдакцыі «Зорка». Цёпла сустрэлі яго будучыя газетчыкі.*

*НА ЗДЫМКУ: Г. Шыловіч гутарыць з чатырохкурсніцамі І. Кунцкай і Б. Трусевіч.*

*Фота М. ПІЛЬШЧЫКАВА.*

*У першым пакоі корпуса «А» дружнай сям'ёй жывуць трэцекурсніцы філалагічнага факультэта Тамара Дземьянава, Тамара Трафімовіч, Надзежда Лось, Іна Кананчанка, Таіса Мішурная і Людмила Якубенка. Займаюцца яны толькі на «добра» і «выдатна». А адпачываюць таксама не горш.*

*НА ЗДЫМКУ: Дзяўчаты з запалам выконваюць сатырычныя прыпеукі, якія яны склалі на берагах Табола, дзе летам ўбіралі ўраджай.*

*Фота М. ПІЛЬШЧЫКАВА.*

## ГЭТА КАРЫСНАЯ СПРАВА

*Нядауна кафедра крымінальнага права і працэсу юрыдычнага факультэта правяла цікавае мерапрыемства—сустрэчу студэнтаў з работнікамі суда і пракуратуры, былымі выпускнікамі універсітэта.*

*На сустрэчу прышлі пракурор Беларускай чыгункі т. Кравец, старшы следчы пракуратуры горада Мінска т. Шапорау, следчы пракуратуры Сталінскага раёна горада Мінска т. Атаманава, эксперт крымналістычнай лабараторыі пры Міністэрстве юстыцыі БССР т. Кучараў, памочнік пракурора Мінскага ўчастка чыгункі т. Дрэйзін, следчы пракуратуры Фрунзенскага раёна сталіцы т. Новак і народны суддзя 2-га ўчастка Ленінскага раёна горада Мінска т. Чэшко.*

*Госці падзялілися са студэнтамі вопытам сваей работы, расказалі аб найбольш цікавых прыкладах з сваей практычнай дзейнасці, аб тых цяжкасцях, якія сустракаюцца у рабоце.*

*Пракурор Беларускай чыгункі т. Кравец расказаў аб добрай рабоце нашых выпускніковў тт. Аутушка, Дрэйзіна, Катлабая. Тав. Аутушка, працуючы следчым, умела і своечасова расследаваў рад складаных спраў аб забойствах, крадзяжах грузаў і г. д. Няма сумнення, што Аутушка атрымаў у сценах ВНУ добрую тэарэтычную падрыхтоўку.*

*З цікавасцю праслухалі студэнты расказы тт. Кравец, Шапорава і Новак аб тым, што работа следчага—цікавая і захапляючая, але патрабуе выключнай настойлівасці, вытрымкі і цярпення.*

*Госці гаварылі аб тым, што універсітэт дае студэнтам-юрыстам глыбокія тэарэтычныя веды. Асабліва звярталася ўвага на вытворчую практыку у органах суда і пракуратуры. У прыклад былі прыведзены выпускнікі—народны суддзя тав. Ціханенка і юрысконсульт Беларускай ваеннай акругі Дмухоуская. Яны атрымалі ва ВНУ глыбокую тэарэтычную падрыхтоўку і зараз з поспехам прымяняюць яе на практыцы.*

*Адзначаліся сумленныя адносіны студэнтаў да праходжання вытворчай практыкі. Разам з тым, адзначыў народны суддзя т. Чэшко, асобныя студэнты недаацэньваюць значэнне практыкі, несумленна адносяцца да яе. Практычныя-ж работнікі праяўляюць лібералізм і выдаюць такім студэнтам станоўчыя характарыстыкі. З гэтым трэба пакончыць раз і назаўседы.*

*Тав. Атаманава заклікала студэнтаў не баяцца накіравання на перыферыю. З горыччу яна гаварыла аб тых студэнтках, якія з мэтай застацца у Мінску пачалі лёгкадумна выходзіць замуж, ісці на любую работу — у якасці нарміроўшчыкаў, планавікоў і г. д. Зараз яны дэкваліфікаваліся, перасталі быць юрыстамі.*

*Ад імя студэнтаў выступілі т.т. Грачко і Качатнова, якія падзякавалі гасцей за іх парады і пажаданні. Развіталіся студэнты са сваімі старэйшымі таварышамі цёпла і дамовіліся сустракацца часцей.*

*І. ЦІШКЕВІЧ.*

## У ЕРЭВАНСКІХ СЯБРОЎ

У мінулым месяцы у сталіцы Арменіі Ерэване праходзіла студэнцкая навуковая канферэнцыя Ерэванскага дзяржаўнага універсітэта. На яе былі запрошаны прадстаўнікі 16 буйнейшых універсітэтаў краіны.

Мы, прадстаўнікі фізіка-матэматычнага факультэта Беларускага універсітэта, таксама прынялі удзел у гэтай канферэнцыі і прачыталі там даклады па фізіцы—«Аб электра-іскравай апрацоўцы металаў» і па матэматыцы—«Аб элементарных уласцівасцях базісаў натуральнага раду лікаў».

На канферэнцыі сустрэліся госці з Кіева, Харкава, Растова-на-Дону, Сталінабада, Баку, Тоілісі, Масквы. Там яны не ўпершыню. Прадстаўнікі з Мінска прыехалі у Ерэван першы раз.

...Пачалося пленарнае пасяджэнне. Адзін за другім выступаюць прадстаўнікі розных ВНУ краіны. А калі слова прадставілася дэлегатам з Мінска, Нікалай Аляхновіч, хвалюючыся выйшаў, перадаў прывітанне ад студэнтаў Беларусі і прыпаднёс у падарунак Ерэванскаму універсітэту ад калектыва БДУ зборнік беларускіх арнаментаў.

На канферэнцыі было праслухана многа карысных дакладаў. Асабліву цікавасць прадстаўляў даклад, зроблены студэнткай 4-га курса геаграфічнага факультэта Э. Канецян на тэму: «Магчымасць выкарыстання энергіі ветра і сонца у Арменіі». Нашы даклады таксама выклікалі цікавасць у слухачоў.

У дні знаходжання у Ерэване мы азнаёмілися са славутасцямі горада, агледзелі усе яго самыя цудоўныя куткі. Мы пабывалі у вядомым кнігасховішчы «Меценадаране». У ім сабраны старажытныя помнікі армянскай, грузінскай і азербайджанскай пісьменнасці. Асаблівую увагу звярнулі мы на працы першага вядомага армянскага матэматыка Ананія Ширакацыя.

Мы, госці розных гарадоў краіны, разам гулялі па прыгожых вуліцах, праспектах і бульварах Ерэвана. Наведалі карцінную галерэю, дзе захоўваюцца не толькі палотны армянскіх, але і многіх рускіх і заходне-еўрапейскіх мастакоў.

У апошні дзень нашага знаходжання у Ерэванскім універсітэце усе мы сабраліся у кабінеце рэктара. Многа гаварыли тады аб жыцці студэнтаў, вучобе і навуковай рабоце у сваіх вышэйшых навучальных установах. Прарэктар па навуковай рабоце Ерэванскага універсітэта тав. Налбандзян уручыў падарункі універсітэтам і асабістыя. Усім прадстаўнікам брацкіх рэспублік, якія прынялі удзел у канферэнцыі, прысвоена званне ганаровага члена СНО Ерэванскага універсітэта.

У Ерэване мы пазнаёмілися не толькі з навуковай работай, жыццём і справамі брацкага народа, мы яшчэ глыбей пазналі нацыянальную культуру армян.

**В. СПРЫНДЖУК,**
**Н. АЛЯХНОВІЧ,**
**студэнты фізмата.**

## Фізкультура і спорт

*Студэнтка III курса філалагічнага факультэта Ларыса Патаповіч — выдатніца вучобы. Другім любімым заняткам яе з'яўляецца спорт. На прайшоўшых нядаўна спаборніцтвах па спартыўнай гімнастыцы сярод ВНУ Мінска Л. Патаповіч заняла другое месца. Зараз дзяўчына ўпарта трэніруецца у спартыўным клубе таварыства «Буравеснік» па праграме майстроў спорту. Яе мара—заваяваць права быць удзельніцай VI Сусветнага фестывалю моладзі і студэнтаў.*

*Фота П. БЕРАЖКОВА.*

### КОРАТКА:

У Гомелі праходзілі занальныя спаборніцтвы II Усебеларускай спартакіяды ВНУ па баскетболу і валейболу. Удзел у іх прынялі каманды нашага універсітэта.

Перад ад'ездам каманды баскетбалістаў правялі таварысцкую сустрэчу з камандай Політэхнічнага інстытута. У жанчын перамаглі нашы баскетбалісты з лікам 47:20. Мужчыны прайгралі політэхнікам (64:55).

* * *

Каманда лёгкаатлетаў нашага універсітэта выязджала для удзелу у спаборніцтвах ВНУ у горад Казань, дзе дабілася добрых вынікаў.

У эстафеце, прысвечанай 87 гадавіне з дня нараджэння В. І. Леніна, праведзенай на вуліцах Казані, нашы лёгкаатлеты занялі першае месца. Выступаючы днём пазней на стадыёне, нашы лёгкаатлеты таксама аказаліся на першым месцы.

* * *

21 красавіка адбыліся спаборніцтвы на прыз адкрыцця летняга спартыўнага сезону. У іх прынялі ўдзел і лёгкаатлеты нашага універсітэта.

У эстафеце 800x400x200x100 наша каманда заняла трэцяе месца.

**І. УСАВА.**

*У напружанай барацьбе праходзілі спаборніцтвы па баскетболу паміж жаночымі камандамі гістарычнага і геолага-геаграфічнага факультэтаў. Перамаглі спартсменкі геафака.*

*НА ЗДЫМКУ: Момант гульні.*

*Фота А. ЛУКАШОВА.*

**Рэдактар А. ВОЛК.**


22 МАЯ 1957 ГОДА

ДАРАГІ ЧЫТАЧ — СТУДЭНТ, АСПІРАНТ, ВЫКЛАДЧЫК, СУПРАЦОЎНІК НАШАГА КАЛЕКТЫВУ!

ТЫ АТРЫМАЎ СВЕЖЫ НУМАР ГАЗЕТЫ „БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ". ШТО ТЫ ЗНАЙШОЎ У ІМ ЦІКАВАЕ, КАРЫСНАЕ? НАПЭЎНА, ТЫ ЗВЯРНУЎ УВАГУ І НА НЕДАХОПЫ.

А ЧЫМ ТЫ САМ ДАПАМОГ ГАЗЕЦЕ? КОЛЬКІ МАТЭРЫЯЛАЎ НАПІСАЎ У СВАЮ ГАЗЕТУ? ТЫ МОЖАШ ПАДКАЗАЦЬ МНОГА ЦІКАВЫХ, ХВАЛЮЮЧЫХ ТЭМ.

*З гэтай мэтай 22 мая ў 18 гадзін арганізуецца*

КАНФЕРЭНЦЫЯ НАШЫХ ЧЫТАЧОЎ

ПРЫМІ Ў ЁЙ УДЗЕЛ! ПАДУМАЙ І ПРАПАНУЙ, ШТО ТРЭБА ЗРАБІЦЬ, КАБ ТВАЯ ГАЗЕТА БЫЛА АДНОЙ З ЛЕПШЫХ СТУДЭНЦКІХ ГАЗЕТ.

ЗРОБІМ СВАЮ ГАЗЕТУ ЗМЯСТОЎНАЙ, ЯРКАЙ І ЦІКАВАЙ!

*Рэдкалегія газеты „Беларускі універсітэт".*

22 МАЯ 1957 ГОДА


Адрас рэдакцыі: Мінск, Універсітэцкі гарадок, Біякорпус, 62, тэл. 2-07-19

АТ 01475 Друкарня выдавецтва БДУ. Зак. 511. Тыраж 2000